***Формы ветлівасці***

**Вітанне**

- Добрай раніцы!
- Дзень добры!//Добры дзень!
- Добры вечар!
- Вітаю!
- Прывітанне!
- Здароў!

**Развітанне**

Да пабачэння!
Да сустрэчы!
Да новай//хуткай сустрэчы
Усяго найлепшага!
Бывай!
Бывайце!
Шчаслівай дарогі!
Дазвольце развітацца з вамі!
Да заўтрага!//Да заўтра!
Да вечара!
Да панядзелка!
Я пайшоў//пайшла! Тэлефануй!
Дабранач!
Пакуль!
Пакедава!

**Пачатак размовы**

- Што новага?
- Што чуваць?
- Як маешся?/маецеся?
- Як жывеш?/ жывяце?
- Як там Ганна?
- Як сябе адчувае твая бабуля, матуля, цётка, твой бацька, дзед, дзядзька?
- Як справы?
    - Дзякуй, усё добра, а як ты?
        выдатна
        вельмі добра
        добра
- Так сабе
- Дрэнна
- Вельмі дрэнна

**Знаёмства**

Спадар
Спадарыня
Спадарства
Шаноўны спадар
Шаноўная спадарыня

Алесь Пятр-**овіч**
Ганна Пятр-**оўна**

Раман Ігнат-**авіч**
Алена Ігнат-**аўна**

Андрэй Васіль-**евіч** Галіна Васіль-**еўна**

- Дазвольце вас пазнаёміць - гэта ... , а гэта ...
гэта спадар ... , а гэта спадарыня ...
- Дазвольце вас пазнаёміць са спадарыняй ... /са спадаром ...
- Дазволь цябе пазнаёміць з маёй сяброўкай/з маім сябрам ...
з маім калегам/ з маёй калегай ...
- Хачу вас/ цябе пазнаёміць з ...
- Мне падаецца, што мы дзесьці ўжо спаткаліся/ што я вас дзесьці ўжо бачыў

Пазнаёміць каго з кім (пазнаём – rozkaz.způsob)
- Пазнаём мяне/нас, калі ласка, з тваёй сяброўкай
- Знаёмцеся – гэта Галя, мая дзяўчына, а гэта Алесь, мой аднагрупнік.

- Вельмі прыемна
- Мне таксама

- Скажыце, калі ласка, як Вас завуць//звацць
- Маё прозвішча Вараноўіч, зваць Ігар Фёдаравіч
- Вельмі прыемна. Карпаў Мікалай Пятровіч. Будзем знаёмыя.
- Вы ўжо знаёмыя?// Вы ўжо пазнаёміліся?
- Я хацеў бы пазнаёміцца з Вамі
- Дазвольце адрэкамендавацца: Сцяпанаў Іван Сяргеевіч
- Дазвольце адрэкамендаваць Вам майго сябра - Зайцава Васіля Яўгенавіча

**Запрашэнне**

Запрашаць
Запрашаем вас на сустрэчу, вячэру, святочны абед
Сардэчна запрашаем!
Вітаем вас /у Мінску/!
- Я хачу запрасіць вас у госці
- Мы просім наведаць нашу фірму

- Як вы ставіцеся да прагулкі пешшу/ пешкі?

- Што ты робіш сёння ўвечары//у нядзелю//?
- А заўтра?
- Дазволь запрасіць цябе/Вас заўтра//у нядзелю ў кіно//на вячэру//на каву//на абед//у тэатр
- Запрашаю цябе ...

- Давай сходзім на канцэрт “Крамбамбулі”//на футбол
- Хадзем з намі на дыскатэку//на піва
- Прыходзь да нас на гарбату

- Дзякуй, я з радасцю прыйду
- Дзякуй, але, нажаль, заўтра я не магу, бо ...
- Шкада, але заўтра ў мяне не атрымаецца, бо ...
- Вельмі хацелася б, але ...

- Праходзьце, калі ласка. Сядайце.
- Зрабіце ласку, праходзьце (сядайце), пачувайце сябе як дома.

- Шчыра дзякую/дзякуем за запрашэнне

**Згода. Пацвярджэнне**

- Так// Але// Ну
- А як жа /ж/!
- Вядома!//Зразумела//Пэўна ж!
- Але, гэта сапраўды так
- Добра, я згодны// згодзен// Добра, згода
- Няма сумнення!
- Так, дамовіліся!// Добра, дамовіліся!
- І я такой самай думкі.
- Праўда ваша!//Вы маеце рацыю!
- Вельмі слушна!
- Слушная прапанова!
- Нельга не пагадзіцца з ім.
- Я не пярэчу// не супраць

**Нязгода. Адмова**

- Не! Не, не!
- Не трэба, дзякую//дзякуй!
- Не, я не магу
- Вельмі шкада, але...
- Я не згодны/згодная
- Я так не лічу
- Ні ў якім выпадку!
- Пра гэта і гаворкі не можа быць!
- Гэта немагчыма /недапушчальна, непажадана/
- Зусім не так!// Цалкам іначай
- Вы памыляецеся
- Я ў гэта не веру//Не магу  даць веры
- Цяжка пагадзіцца з такім падыходам
- Мы ніколі гэтак не зробім//з гэтым не пагодзімся

**Падзяка**

Дзякаваць каму

- Дзякуй!
- Вялікі дзякуй!
- Шчыра дзякую!
- Сардэчна дзякую вам//сардэчны вам дзякуй за ўсё, што вы зрабілі для мяне (для нас)
- Я вам вельмі абавязаны//абавязана!
- О, гэта вельмі міла з вашага боку// вельмі прыязна//ласкава!
- Дзякуй за кнігу, я яе абавязкова прачытаю. – Чытайце, калі ласка!
- Няма за што дзякаваць!
- Дзякуй, бабуля!
- Расці вялікі!
- Дзякуй за дапамогу!
- Няма за што
- Калі ласка!
- Будзьце ласкавы!
- Прашу вас!

**Прабачэнне**

Даравацьь каму
- Даруй! Даруйце
- Прабач//Прабачце, калі ласка
- Прабачце, але я зараз заняты
- Прашу прабачэння, што прымусіў Вас чакаць
- Мне вельмі непрыемна//прыкра, што я турбую Вас, але...
- Прабачце, што я мушу Вас патурбаваць
- Не сярдуйце// не злуйцеся калі ласка, што так атрымалася// здарылася
- Няма мне даравання!
- Дазвольце спытаць//запытацца (прадставіць вам ..., прадставіцца: ..., вам дапамагчы)

- Будзьце ласкавы, перадайце мне ...
- Скажыце, калі ласка, калі (дзе, хто, чаму)
- Не турбуйцеся // не клапаціцеся

- Дзе тут уваход?
- Сюды, калі ласка// Вось тут, прашу Вас!

- Тут можна курыць?
- Так, калі ласка

**Віншаванне**

Віншую цябе/вас!
Дазвольце павіншаваць Вас з ...

са святам
з днём нараджэння!
з юбілеем

са шлюбам

З Новым годам! З новым шчасцем!

З нараджэннем сына /дачкі

Павіншуйце іх ад майго імя

Шлю вам свае віншаванні з нагоды ...